Асмалоўскі А.

# ПАМЯЦЬ АБ ГЕРОІ БУДЗЕ ЖЫЦЬ

29 чэрвеня 1944 года 65-я армія ў цесным узаемадзеянні з 48-й поўнасцю вызваліла Бабруйск ад фашысцкіх захопнікаў. У гэтых баях вызначыўся ўраджэнец в. Старое Сяло Мсціслаўскага раёна палкоўнік Іван Міхайлавіч Паўловіч. Пачынаючы з прарыву вельмі ўмацаванай, глыбока эшаланіраванай абароны немцаў на правым беразе ракі Друць у раёне Рагачова і далейшым разгромам і праследаваннем праціўніка, Паўловіч заўсёды знаходзіўся на самых адказных участках баявых дзеянняў.

Аднойчы ў час атакі другі батальён 1343-га стралковага палка, трапіўшы пад моцны артмінамётны і кулямётны агонь ворага, быў вымушаны залегчы. Стварылася пагроза выкананню баявой задачы. І тады ў баявыя парадкі батальёна выйшаў намеснік камандзіра дывізіі Паўловіч і са зброяй у руках павёў байцоў на штурм варожай абароны. У рукапашнай схватцы ён асабіста знішчыў некалькі салдат і афіцэраў праціўніка. Пастаўленая баявая задача была выканана, абарона фашыстаў прарвана.

29 чэрвеня І. М. Паўловіч арганізаваў фарсіраванне ракі Бярэзіны пад Бабруйскам. На падручных сродках разам з разведчыкамі ён пераправіўся праз раку і першым уварвауся ў горад. На чале з ім перадавыя падраздзяленні прабіліся да цэнтра горада, дзе потым злучыліся з часцямі 65-й арміі, акружыўшымі Бабруйск з захаду.

Баі за вызваленне Беларусі працягваліся. У ноч з 19 на 20 ліпеня Іван Міхайлавіч знаходзіўся на назіральным пункце камандзіра 1343-га стралковага палка, на захад ад вёскі Навіннік Гайнаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Становішча было такое. Пяхота ворага ў суправаджэнні 60 танкаў з аўтаматчыкамі, некалькіх самаходных гарматаў перайшла ў контратаку з мэтай змяць полк і адкінуць назад часткі дывізіі. Каб процістаяць шалёнаму націску фашыстаў, закаваных у браню, патрабаваліся выключная стойкасцць байцоў і афіцэраў, уменне камандзіра павесці іх за сабой. Такім і на гэты раз праявіў сябе Паўловіч. Ён знаходзіўся ў баявых парадках стралковых падраздзяленняў, не адступаючы ні на крок, страляў у насядаўшых фашыстаў. Гледзячы на свайго камандзіра, байцы з яшчэ большай нянавісцю ішлі на ворага, які быў спынены і разгромлены.

На полі бою засталіся сотні трупаў нямецкіх салдатаў і афіцэраў, некалькі дзесяткаў падбітых і абгарэлых танкаў і самаходкаў. Нажаль, у гэтым баі загінуў і сам Іван Міхайлавіч Паўловіч. Выдатнаму камандзіру пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкагага Саюза.

**Асмалоўскі, А. Памяць аб герої будзе жыць / А. Асмалоўскі // Бабруйскае жыццё. — 1994. — 22 чэрвеня. — С. 2.**